# ЗЯЛЁНАЯ КНІГА I.R.A.

# I.R.A.'s Green Book



Смаленск
2007

# Зьмест

Прадмова....3
Аб гэтай кнізе....3
Прадмова да беларускага выданьня....3
ЧАСТКА I....4
Вораг. Аспэкт: мэтодыка барацьбы....10
Стратэгія партызанскай вайны....11
ЧАСТКА II: АНТЫ-ДОПЫТАВАЯ ТАКТЫКА....12
Арышт....12
Допыт....13
Допыт: аналіз....15
Псыхалягічныя катаваньні....19
ЧАСТКА III: ПРАЦЭДУРА ВАЕННАГА ТРЫБУНАЛА I.R.A....22

# Прадмова

## Аб гэтай кнізе

Зялёная Кніга - гэта частка адукацыйнага матэрыялу для добраахвотнікаў Ірлядзкай Рэспубліканскай Арміі – I.R.A. Вядомыя толькі два выданьня гэтай кнігі – 1956 і 1977 годоў.

Першапачаткова тэкст друкаваўся рукамі на друкарскіх машынках і распаўсюджваюся таемна. Зялёная кніга лічылася сакрэтнай, яе матэрыял нельга было перадаваць і абмяркоўваць ні з кім, акрамя чальцоў I.R.A. За парушэньне гэтага правіла вінаваты караўся велізарнымі штрафамі і нават Ваенным Трыбуналам.

Зараз у Паўночнай Ірляндыі трывае хісткае замірэньне, а сама Зялёная Кніга, як і яе дасьледаваньні, зьявілася ў Сеціве і свабодным друку.

## Прадмова да беларускага выданьня

Ірляндзкі і беларускі народы – сваякі. Нам выпалі аднолькава пакручастыя гістарычныя шляхі. Імпэрыялістычныя ўсходнія суседзі цягам стагоддзяў рабавалі і калянізавалі нашыя краіны, нішчылі мову і культуру.

У XX ст. мы дамагліся незалежнасьці, але нашыя ўрады па-ранейшаму вымушаныя ісьці ў рэчышчы былых мэтраполіяў. Беларусі нават зноў пагражае паглынаньне суседняй імпэрыяй. У любым выпадку, лепш заранеў падрыхтавацца да горшага, скарыстаўшыся з баявога досьледу ірляндзкіх братоў.

Яшчэ адна трагічная абставіна прыпадабняе Ірляндыю і Беларусь – акупацыя імпэрыялістамі паўночна-усходніх частак нашых краін, якая зацягнулася аж да XXI стагоддзя. Нельга казаць пра Вольную Ірляндыю бяз Ольстэра, гэтак жа немажліва ўявіць Вольную Беларусь без Смаленшчыны.

Памятайма пра наш беларускі Ольстэр: Смаленск, Невель, Себеж яшчэ чакаюць на ўзьяднаньне з Бацькаўшчынай.

Яны чакаюць на тваю дапамогу, чытач!

*Перакладчык*



# ЧАСТКА I

Вернасьць рэспубліканскаму руху ёсьць цьвёрдае перакананьне, што барацьба - і ўзброеная, і палітычная - маральна апраўданая, і што ваенныя дзеяньні таксама маральна апраўданыя; што Ірляндзкая Рэспубліканская Армія - непасрэдны прадстаўнік Дайла [Ірляндзкага Парлямэнту] 1918 г., і што яна зьяўляецца законным і паўнамоцным урадам Ірляндзкае Рэспублікі, які валодае маральным правам выдаваць законы і прад'яўляць правы на тэрыторыю, паветраную прастору, карысныя выкапні, сродкі вытворчасьці, разьмеркаваньне і пераразьмеркаваньне чалавечых рэсурсаў незалежна ад іх [рэлігійных] поглядаў і [палітычнай] прыналежнасьці.



НЕ РАЗМАЎЛЯЙЦЕ Ў ГРАМАДЗКІХ МЕСЦАХ: НЕ ГАВОРЫЦЕ НІ СВАЁЙ СЯМ'І, НІ СВАІМ СЯБРАМ, НІ КАХАНАЙ ДЗЯЎЧЫНЕ, НІ КАЛЕГАМ ПА ПРАЦЫ, ШТО ВЫ – ЧАЛЕЦ I.R.A. НЕ ВЫКАЗВАЙЦЕСЯ ПА ПЫТАНЬНЯХ УЗБРОЕНАЙ БАРАЦЬБЫ - ІНШЫМІ СЛОВАМІ, НІЧОГА НІКОМУ НЕ ГАВОРЫЦЕ. Не прымайце ўдзел у маршах, дэманстрацыях і іншых масавых акцыях пратэсту. Не паказвайцеся сярод вядомых рэспубліканцаў і не бывайце частым госьцем у іхных хатах. Ваша асноўная задача - заставацца невядомым для варожых сілаў і грамадзкасьці ў цэлым.

Добраахвотніку важна таксама ўразумець рызыку ад ужываньня сьпіртовых напояў і сапраўды рэальную небясьпеку ад п'янства. Значны аб'ём інфармацыі варожыя сілы і мясцовыя шпегі атрымалі ад тых добраахвотнікаў, якія пілі сьпіртное. Добраахвотнікі павінны ведаць, што гутаркі на падпітку – НАЙБОЛЬШАЯ ПАТЭНЦЫЙНАЯ НЕБЯСЬПЕКА, якая пагражае ўсялякай арганізацыі. А для арганізацыі ваеннай - гэтае САМАЗАБОЙСТВА.

Ірляндзкая Рэспубліканская Армія, як законны прадстаўнік [інтарэсаў] ірляндзкага народа, валодае маральным правам на правядзеньне кампаніі супраціву замежным акупацыйным сілам і мясцовым калябарантам. Усім добраахвотнікам варта ўсьвядоміць сваё маральнае права дзейнічаць у якасьці законнага ўрада, паколькі ўдзельнікі I.R.A. зьяўляюцца жаўнерамі Ірляндзкай Рэспублікі, загнананай у падпольле пераўзыходзячымі сіламі ворага.

I.R.A. – арганізацыя, якая патрабуе ад вас поўнай, без астатку, самаахвярнасьці... 

У мінулым шмат хто ўступаў у шэрагі I.R.A. у пошуках рамантыкі, альбо прыгод; аднак, апынуўшыся ў турме, яны сталі інакш глядзець на свае абавязкі перад I.R.A. Зь вялікім спазьненьнем яны ўсвядомілі, што насамрэч ня маюць сапраўднага жаданьня быць добраахвотнікамі. Вынікам гэтага зьяўляецца раскол сярод самых зьняволеных, разлад у іхных сем'ях і звады сярод іхных сяброў на волі. Наступным важным момантам трэба лічыць шчырую гатовасьць добраахвотніка падпарадкавацца загадам старэйшага па званьні. Усім

добраахвотнікам ставіцца ў абавязак падпарадкоўвацца старэйшаму па званьні незалежна ад іх асабістых адносінаў.

Перад тым, як патэнцыйны добраахвотнік вырашыць уступіць у I.R.A., ён мусіць цалкам усьвядоміць усе зьвязаныя з гэтым пытаньні і наступствы. Яму ня трэбаісьці ў I.R.A. з эмацыйных, рамантычных альбо прыгодніцкіх чыньнікаў. Ён павінен падрабязна вывучыць свае матывы, усьвядоміць непазьбежныя пагрозы і зразумець, што ніякай рамантыкі ў Руху ён не спаткае. Ізноў-ткі яму трэба дасьледаваць свае палітычныя матывы, узяўшы да ўвагі, што I.R.A. імкнецца да стварэньня Сацыялістычнае Рэспублікі.

Добраахвотнікі рыхтуюцца да вайсковай вызваленчай барацьбы супраць пераўзыходзячых шматлікіх сілаў ворага. Гэтая барацьба ўключае выкарыстаньне зброі і выбуховых рэчываў. Перадусім – ручной зброі. Калі добраахвотнікі праходзяць курс ваеннай падрыхтоўкі, яны павінны цалкам зразумець, што зброя небясьпечная сама па сабе, яе галоўнае прызначэньне – забіраць чалавечыя жыцьці, іншымі словамі – забіваць людзей; добраахвотнікі навучаюцца забіваць людзей. Практычна немагчыма ўзяць у рукі зброю і забіць чалавека без усялякае мэты, ня маючы трывалага перакананьня і апраўданьня. I.R.A. дзейнічае зыходзячы з тых прынцыпаў, якія, у сваю чаргу, забясьпечваюць ёй існаваньне як ваеннай арганізацыі; перад тым, як патэнцыйны добраахвотнік становіцца яе часткай, ён павінен выхаваць у сябе гэтыя прынцыпы - каб у далейшым мець магчымасьць, абапіраючыся на іх, забіваць без прамаруджваньня і шкадаваньня. Тое ж справядліва і ў дачыненьні да арганізацыі выбухаў. Жадаючыя ўступіць у I.R.A. павінны разумець, што, калі справа тычыцца пазбаўленьня чалавека жыцьця, на месцы гэтага чалавека могуць апынуцца і яны самі. Калі добраахвотнік пойдзе страляць па жаўнерах ці паліцыянтах, ён цалкам павінен усьведамляць, што яны адкажуць тым жа. Жыцьцё ў падпольнай Арміі – экстрэмальна цяжкае, жорсткае і поўнае расчараваньняў. Таму, перад тым, як прыняць канчатковае рашэньне аб уваходжаньні ў I.R.A., трэба аб усім гэтым сур'ёзна задумацца.

Ірляндцы вылучыліся як нацыя больш за 1,000 гадоў таму, і гэта факт, прызнаны як у самой краіне, так і за мяжой. Па сьведчаньнях прафэсара Edmund Curtis, які апісвае Ірляндыю 800-га года па Н.Х., "ірляндцы былі першым народам на поўначы ад Альп, якія стварылі такую вялізную колькасьць літаратурных крыніц на сваёй роднай мове". Паводле дадзеных прафэсара, даны (вікінгі) былі часткова выгнаныя, часткова асыміляваныя народам, "чыя культура сьветачам зьзяла па ўсёй Эўропе" да Нарманскай заваёвы ў 1169-м (нарманы захапілі Ангельшчыну ў 1166-м), і якія прынесьлі "больш за васьмісотгадовую БЯЗЬЛІТАСНУЮ І НЯЗГАСЛУЮ ВАЙНУ, якая працягваецца і па гэты дзень."

Мэта гэтай васьмісотгадовай акупацыі - "эканамічная эксплёатацыя незаконна аддзеленых шасьці графстваў Поўначы, якія знаходзіліся пад непасрэдным каляніяльным ціскам Брытаніі" і ірляндзкага Поўдня, "які адчувае на сабе культурны і эканамічны ціск з боку Лёндана". Апошняе выяўляецца ў тым, што ірляндцы, "зь меркаваньняў атрыманьня большага прыбытку", інвэстуюць у ангельскую эканоміку; а тысячы ірляндзкіх юнакоў і дзяўчат затым вымушаныя эміграваць у Ангельшчыну ў пошуках працоўных месцаў, якія ў сваю чаргу, былі створаныя гэтымі самымі інвэстыцыямі.

Іншай немалаважнай праявай эканамічнага імпэрыялізму ў дзеяньні можна лічыць вываз сыравіны, неапрацаваных матэрыялаў: жывёлы, карысных выкапняў, рыбы, вылаўленай замежнымі траўлерамі, і г.д. Акрамя таго, з 1958 года Вольная Дзяржава (Ірляндыя) спыніла ўсялякія спробы зрабіць сваю эканоміку незалежнай і прыцягнула на сваю тэрыторыю транснацыянальныя замежныя карпарацыі для стварэньня новых працоўных месцаў - замест таго, каб выкупіць у іх тэхналёгіі і потым паступова высылаць іх назад.

"Афрыканізацыя" - так інакш завуць гэты працэс. Зараз ірляндцы маюць яшчэ менш магчымасьцяў распараджацца сваімі нутранымі справамі, чым у 1921-м годзе. Лягічным

працягам гэтай сытуацыі стаў ўступ Ірляндыі ў 70-х гадох у ЭЗ. Рэспубліканскі рух супрацівіўся гэтаму - як на Поўначы, так і на Поўдні - у 1972-м і 1975-м – і дагэтуль не зьмяніў сваё меркаваньне.

Рэспубліканцы выступаюць супраць палітыка-эканамічных блёкаў Усходу і Захаду і такіх вайсковых альянсаў, як NATO і Варшаўскі пакт. Рэспубліканскі рух стаіць на баку роднасных ірляндцам кельцкіх і іншых прыгнечаных народаў Эўропы, а таксама нэўтральных краінаў Трэцяга Сьвету, якія не ўваходзяць ні ў якія альянсы; рэспубліканцы, у адпаведнасьці з нацыянальнымі традыцыямі - прыхільнікі іншай альтэрнатывы: сацыялізму, пераўзыходячага і заходні прыватны капіталізм, і ўсходні дзяржаўны.

Пазыцыя, занятая I.R.A. з моманту яе фундацыі ў 1916-м годзе, ёсьць супраціў і барацьба супраць любых праяваў імпэрыялізму, знаходжаньне ў авангардзе рэвалюцыйнае думкі і самая дасканалая ў сьвеце партызанская ваенная тактыка.

Вехамі нашага шляху былі нягоды і перамогі ў бітвах, кроў і вялізныя ахвяры, турэмныя зьняволеньні, галадоўкі, пакараньні; і ўсё жа нам удаецца наносіць ўдары па ворагу, часьцяком у самае сэрца брытанскага імпэрыялізму, набыць павагу і адкрытае захапленьне вольналюбівых народаў ва ўсім сьвеце.

*НАТАТКА: Маральная пазыцыя I.R.A., яе права весьці вайну, базуюцца на:*
*a) праве супрацівіцца замежнай агрэсіі;*
*b) праве паўставаць супраць тыраніі і прыгнёту;*
*c) пераемнасьці і працягу прынцыпаў, адзначаных Часовым Урадам 1916-га г., Першым Дайлом 1919-га і Другім Дайлом 1921-га гг.*




У 1938-м сямёра выжыўшых дэпутатаў-рэспубліканцаў перадалі паўнамоцтвы камандаваньню I.R.A., прытрымліваючыся прынятай у 1921-м г. рэзалюцыі. У 1969-м апошні дэпутат (рэспубліканскага Дайла), Джозаф Кларк, ізноў адкрыта пацьвердзіў, што дзеючае камандаваньне I.R.A. і ўсе, наступныя за ім, зьяўляюцца пераемнікамі Першага і Другога Дайла ў якасьці часовага ўрада.

Знакі эканамічнага імпэрыялізму ў Ірляндыі бачныя паўсюль: у банкаўскай сфэры, страхаваньні, гандлі, машынабудаваньні, здабыцьці карысных выкапняў, рыбнай гаспадарцы, вытворчасьці ў цэлым; гэта такія кампаніі, як ICI, Courtaulds, Pye, Philips, Grundig, Shell-BP, Wimpey і г.д. Культурны імпэрыялізм, які разьвіваецца з часоў падпісаньня здрадніцкай дамовы з Ангельшчынай, ірляндзкі урад навязвае і прапагандуе праз CMI, R.T.E. (Дзяржаўная тэлерадыёвяшчальная кампанія Ірляндыі), друк і адукацыю.

Наша палітычнае бяспраўе, беспрацоўе, галеча, недахоп жыльля, сацыяльная неабароненасьць, эксплёатацыя нашай працы і інтэлекту, прыродных багацьцяў, барбарскае разбурэньне нашай культуры, зьнішчэньне мовы, музыкі, жывапісу, тэатра, нашых звычаяў і традыцыяў, нутрапалітычны ціск - (усё гэта) неабходна для падтрыманьня існуючага рэжыму ў цэлым.

Урад (будучы) дазволіць кожнаму чалавеку ўдзельнічаць у прыняцьці рашэньняў, якія наўпрост яго датычацца. Гэта дасягаецца праз дэцэнтралізацыю ўлады і разьмеркаваньне яе па найменшых сацыяльных органах мясцовага ўзроўня, так, каб усё маглі ёй распараджацца - як асабіста, так і сумесна - у нацыянальных інтарэсах. Нашыя дзеяньні ў вобласьці палітыкі і эканомікі будуць накіраваныя на падаўленьне сацыяльнага імпэрыялізму: права ўладаньня багацьцямі Ірляндыі павінна быць вернута яе народу праз сыстэмы каапэрацыі, працоўнай уласнасьці і кантроля над прамысловасьцю, а таксама сельскай і рыбалоўнай гаспадаркай.

На культурным фроньце мы спадзяемся адрадзіць гэльскую (ірляндзкую) мову; не дзеля нацыянальнага шавінізму, але зыходзячы з таго пунку гледжаньня, што культурнае адраджэньне дапаможа стварэньню новай выразнай Ірляндзкай Сацыялістычнай Дзяржавы, здольнай супрацьстаяць усім уварваньням імпэрыялізму. На міжнародным узроўні мы спадзяемся скласьці саюз з прагрэсіўнымі ўрадамі і былымі калёніямі (як і некалі наша краіна), для таго, каб, па-першае, узаемавыгадна супрацоўнічаць і, па-другое, утаймоўваць дзейнасьць вайсковых і эканамічных імпэрыялістычных блёкаў ва ўсім сьвеце.

Першыя цяжкасьці, зь якімі сутыкаецца навабранец, зьвязаныя зь яго няўменьнем абыходзіцца са зброяй, няведаньнем вайсковае справы, асноваў бясьпекі, тактыкі вядзеньня допытаў і г.д.

У каманднага афіцэра, магчыма, не атрымаецца адразу ж наставіць сваё падраздзяленьне на ваенны лад, афіцэру выведкі - арганізаваць эфэктыўную інфармацыйную сетку, а старшыні [палітычнае] рады - правесьці кампанію па тым ці іншым пытаньні (як, напрыклад, сытуацыя ў Н-блёку). Таму мы зьвяртаемся да ўсіх чальцоў руху - незалежна ад званьня і прыналежнасьці да таго ці іншага падраздзяленьня - зь пераканаўчай просьбай падтрымаць нашу агульную справу шляхам забесьпячэньня неабходнай падрыхтоўкі і арганізацыі навучаньня (як агульнага, так і самастойнага).

Перад тым, як распачаць вайсковую ці палітычную атаку, нам трэба забясьпечыць сабе як мага больш шчыльную абарону. Так, напрыклад, нашыя заявы аб Аб'яднанай Ірляндыі не павінны быць галаслоўнымі - т.ч. нам неабходна ўмець даказваць права на такую дзяржаву ў процівагу існуючаму падзелу; нам ня варта зьвяртацца да сродкаў рэвалюцыйнага гвалту, калі мы ня можам давесьці, што гэта - скрайняя, але неабходная мера.



Іншымі словамі, мы ня можам дазволіць сабе эскаляцыю вайны без належнага забесьпячэньня, плянаваць апэрацыю, загадзя не стварыўшы сабе трывалы тыл з удакладненых дадзеных выведкі, сілаў бясьпекі, зброі ў баявой гатоўнасьці і добраахвотнікаў, дасьведчаных, як паводзіць сябе ў выпадку арышту ці допыту, і зразумела ж, падтрымкі саюзьнікаў.

Нават тыя сытуацыі, у якіх аб выбухах папярэджвалі загадзя, вораг можа павярнуць на сваю карысьць; гэта таксама вынік нашых памылак, непрадбачлівасьці і адсутнасьці запасу трываласьці. Возьмем выпадак Крывавай пятніцы (масавыя выбухі, арганізаваныя I.R.A.; лічыцца, што такім чынам I.R.A. адрэагавала на падзеі Крывавай Нядзелі - заўв. перакл.). Тут памылка была альбо ў тым, што мы працягвалі верыць ворагу і спадзяваліся на тое, што ён прыме сур'ёзна нашы папярэджаньні аб выбухах, альбо ў тым, што мы пераацанілі здольнасьць брытанцаў

ліквідаваць такія шматлікія апэрацыі.

Аднак факт застаецца фактам: мы зрабілі памылку і вораг гэтым скарыстаўся.

Іншыя прыклады: калі добраахвотнік жыве на адным і тым жа месцы, ворагу лёгка яго арыштаваць; калі зброя схавана няўмела або нядбайна, вораг дзейнічае неадкладна, і - асабліва ў апошні час - забівае добраахвотнікаў, калі яны вяртаюцца да свайго склада. Вораг здабывае карысьць з канфлікту паміж "афіцыйнай" і "часавай" I.R.A., ніяк не ўмешваючыся ў сытуацыю, каб у грамадзкасьці стварылася скажонае ўражаньне, і мы былі бы пазбаўленыя падтрымкі. Вораг гуляе на канфрантацыі паміж I.R.A. і лаялістамі, прымаючы бок апошніх і нападаючы на нашыя падрадзяленьні. Плюс да ўсяго - вораг фармуе адмоўныя адносіны да I.R.A. з боку грамадзкасьці.

Мы таксама атрымліваем карысьць з хібаў ворага, робячы гэтыя факты здабыткам галоснасьці. Уводзіны камэнданцкай гадзіны на Фолз Роўд, Крывавая Нядзеля, інтэрнаваньне, а таксама забойства Джона Бойла ў Данлое - вось тыя найсур'ёзныя памылкі ворага, якія дапамаглі нам заваяваць прыхільнікаў.

Тактыка дыктуецца існуючымі ўмовамі. Лёгіка дзеяньняў і тут зноў вельмі простая. Без падтрымкі добраахвотнікаў, вайскоўцаў, фінансавага забесьпячэньня і г.д. ня можа быць і размовы ня толькі аб ваеннай кампаніі, але і аб правядзеньні шараговай апэрацыі. У верасьні 1969-го сытуацыя была такая, што мы ніяк не маглі страляць па брытанцах, аднак пасьля ўвядзеньня камэнданцкай гадзіны на Фолз Роўд насельніцтва пачало ўспрымаць іх, як мішэні.

Больш сьвежы прыклад: кіраўніцтва Сацыял-дэмакратычнай лейбарысцкай партыі выявіла сябе калябарантамі і перайшло ў шэрагі нашых ворагаў. Ад 1974-го намі ўжываецца тактыка абсьмейваньня ворага - напрыклад, вывальваньне ў пер'і і смале; так зрабілі з тымі, хто ўваходзіў у Выканаўчы камітэт, з тымі, хто катаваў і адпраўляў ірляндцаў у канцлягер, з тымі, хто зьдзекаваўся з удзельнікаў страйкаў. Тое ж было бы справядліва і ў дачыненьні да чальцоў урада, якія мяркуюць, што "жыцьцё - гэта адно, а палітычны статут - зусім іншае", калі размаўляюць аб сытуацыі ў Н-блёках.

Мера засьцярогі ў такіх выпадках - папярэдняе апавяшчэньне гэтых людзей аб складзе зробленага імі злачынства, т.ч. аб тым, што насамрэч значылі вымаўленыя імі словы.

З гэтага вынікае, што правамернасьць або неправамернасьць апэрацый залежыць ад нашых тлумачэньняў, за шта канкрэтна мы арганізуем выбухі, караем злачынцаў, ліквідуем здраднікаў, шпіёнаў і ім падобных.

Мы не выключаем магчымасьці правядзеньня апэрацый у сытуацыях, якія не поўнасьцю задавальняюць названым умовам. Ужо зараз маецца шмат прыкладаў, калі нам даводзілася адыходзіць ад зададзеных парамэтраў ацэнкі дзеля прапаганды і здабыцьця падтрымкі.

Аднак нават у непрадбачаных умовах – пры тым, што нашы дзеяньні маюць дастатковае апраўданьне, а трывалая абарона забясьпечаная – усё-ткі варта знайсьці адносна спакойную вобласьць, адкуль можна было бы прыступіць да апэрацыі: калі наша вымушаная акцыя і знойдзе падтрымку, усё ж неабходна, па магчымасьці, прытрымлівацца правілаў вядзеньня бою.

Доўгатэрміновая мэта: дэмакратычная сацыялістычная рэспубліка
Кароткатэрміновая мэта: выгнаць брытанцаў



## Вораг. Аспэкт: мэтодыка барацьбы

Агульна кажучы, "вораг" - гэта ўсе тыя, хто супрацівіцца правядзеньню ў жыцьцё нашых каротка- і доўгатэрміновых праграм.

Аднак варта ўлічваць, што ворагі самі па сабе неаднолькавыя, і таму не існуе адзінай мэтодыкі барацьбы супраць іх усіх. Такім чынам, нам варта адрозьніваць іх, падзяляць на групы і выпрацоўваць для кожнай з груп свой мэтад ліквідацыі. Некалькі прыкладаў: існуюць ворагі па няведаньні, з прычыны адсутнасьці належных дзеяньняў з нашага боку, нашых памылак і, вядома ж, ворагі ў кіруючых колах.

Ворагаў па няведаньні можна спрабаваць ухіліць шляхам асьветы, хоць усе гэтыя спробы ні да чаго не прывядуць, калі толькі мы самі спачатку ня зоймемся ўласнай адукацыяй. У нашым распараджэньні - маршы, дэманстрацыі, лёзунгі, заявы ў друку, рэспубліканская прэса, публікацыі і, безумоўна, прыватныя размовы. Як ужо было сказана, найперш нам самім трэба вучыцца, нам неабходна ўмела арганізоўваць маршы і іншыя акцыі пратэсту, маляваць графіці, распасюджваць газэты, пісаць артыкулы ў рэспубліканскую прэсу і рабіць заявы.



Зьяўленьне ворага з прычыны памылак або бяздзейнасьці залежыць ад нашых паводзінаў - як індывідуальных, так і калектыўных - і мэтада вядзеньня барацьбы. Жанчыне, у чыёй хаце хаваецца добраахвотнік, які выбіў дзьверы, патрабны неадкладныя выбачэньні, а яе хата - у рамонце; суседзяў і блізкіх злачынцы ці здрадніка трэба інфармаваць, за шта ён быў пакараны.

Іншымі словамі, мы павінны дзейнічаць так, каб, калі і не заваёўваць новых сяброў, то хоць бы не памнажаць сваіх ворагаў.

У кіруючыя колы ўваходзяць усё тыя, хто зацікаўлены ў тым, каб наяўная сытуацыя ў палітыцы, СМІ, судаводзтве і эканоміцы захоўвалася бяз зьменаў, і каб роля ваеннай машыны брытанцаў (войскі, лаялісты, RUC, турэмшчыкі і тыя, хто праводзіць пяратрусы) была такой жа значнай. Мэтады вядзеньня барацьбы са згаданымі ўзброенымі сіламі кіруючых колаў добра вядомыя і шматкроць апісаныя. Акрамя асобных выключэньняў – у выглядзе міністраў "кіраваньня па справах Паўночнай Ірляндыі" і некаторых службоўцаў судовай сыстэмы – няўзброеная частка кіруючых колаў не ўспрымаецца насельніцтвам у якасьці ворагаў, роўных войску і RUC.

Наша задача, адпаведна, растлумачыць людзям, чаму кіруючыя кругі ўсё ж зьяўляюцца ворагамі і зноў, у залежнасьці ад якія існуючых ўмоваў і нашых магчымасьцяў па стварэньні абароны, зьвярнуцца да таго ці іншага мэтаду барацьбы. Кара, як ужо гаварылася раней, не зьяўляецца адзіным спосабам пакончыць з гэтым ворагам: мы можам выявіць іх ілгунамі, крывадушнікамі, шпіёнамі, або проста абсьмяяць. The ‘Mason-Superthug’ poster image, the ‘Captain Nervewreck’ cartoon strip, the Conor ‘Booze’ O’Brien pun (гульня слоў, дыскрэдытуючая ўладу і ідэолягаў - заўв. перакл.).

## Стратэгія партызанскай вайны

Шмат вобразаў выкарыстоўвалася, каб апісаць партызанскую вайну, найбольш удалы прыклад - "вайна блыхі". Уявіце сабе блыхаў, якія змардоўваюць вялізарную жывёлу. Гэтаксама - з партызанскім войскам, кшталту I.R.A., якая ўжывае тактыку ўдара і ўцёкаў супраць брытанцаў, адначасова нападае на мяккае эканамічнае падбрушша ворага, і чакае выбыцьця ворага з барацьбы ад эфэктыўнай партызанскай кампаніі, стратэгію якой можна выкласьці ў пяці пунктах:

1. Барацьба супраць варожых сіл; мэта - як мага большы лік ахвяр. Ужываецца як сродак вывядзеньня ворага з барацьбы пры дапамозе ціску на сваякоў загінулых.
2. Арганізацыя выбухаў; мэта - пазбавіць ворага фінансавых інтарэсаў у нашай краіне і адначасна сарваць доўгатэрміновыя дамовы аб інвэстыцыях.
3. Шэсьць Графстваў павінны і далей заставацца непадуладнымі ўраду, пад кантролем толькі акупацыйных сіл Брытаніі.
4. Весьці вайну, адначасова агітуючы за яе спыненьне - як тут, так і ва ўсім сьвеце.
5. Адстойваць мэты вызваленчай барацьбы, змагаючыся са злачынцамі, даносчыкамі і шпіёнамі.

Галоўным матывам, які вызначае выбар тактыкі, для нас зьяўляецца дабрабыт сяброў, сваякоў і тых, дзеля каго мы праводзім тую або іншую апэрацыю. Для ворага ж усё гэта не мае ніякага значэньня, паколькі ён мае справу з "абстрактным прадметам", недаразьвітым замежнікам-ірлашкам, "пэддзі"; у яго ў распараджэньні знаходзяцца дапаможныя сродкі ў выглядзе войска, паліцыі і г.д. - MRF, SAS, выведка, працуючая пад прыкрыцьцём, падраздзяленьні, апранутыя ў грамадзянскую вопратку.

У гэтым сэнсе найбольш яскравая розьніца паміж брытанскім жаўнерам і ірляндзкім добраахвотнікам (апроч таго, што брытанцы ўяўляюць сабой замежныя акупацыйныя сілы, якія ня маюць ні маральнага, ні гістарычнага права знахадзіцца тут) выяўляецца ў сіле падтрымкі [мясцовага насельніцтва], рашучасьці [прытрымлівацца абранага курса] і ў свабодзе ўласнай ініцыятывы.

Усё, што ёсьць у брытанцаў - раскватараваныя войскі, склады, зброя, грошы і г.д. - атрымана ў выніку прымусовай выплаты падаткаў. Людзі, якія заплацілі гэтыя падаткі, ніколі ня мелі магчымасьці выказаць свае адносіны да таго, куды ідуць іх грошы, ды ад іх гэтага і не патрабавалі - ніякіх дэмакратычных мер для гэтага ў прынцыпе не прадугледжана. Чальцы I.R.A., насупраць, абапіраюцца толькі на добраахвотную падтрымку мясцовага насельніцтва.

Чалец I.R.A. становіцца такім па ўласным жаданьні. Яго прынцыпы - адзінае, што абавязвае яго ўступіць у Армію; яго мэты - гэта палітычная свабода, сацыяльная і эканамічная справядлівасьць для ўласнага народа. Брытанец, апроч таго, што ў сярэднім хоць некалькі хвілінаў падвяргаецца небясьпецы нападу, ня мае свабоды ўласнай ініцыятывы. Ім распараджаюцца, паказваюць, калі класьціся, дзе начаваць, калі ўставаць, як праводзіць свой вольны час і г.д.

Ірляндзкі добраахвотнік, за выключэньнем тых выпадкаў, калі выконвае нейкае адмысловае даручэньне, дзейнічае ў асноўным па ўласнай ініцыятыве і, такім чынам, павінен быць гатовы несьці за гэта адказнасьць. Пры гэтым яму неабходна паводзіць сябе так, каб, выконваючы загад, не гуляць на руку брытанцам, якія спрабуюць ізаляваць нас ад уласнага народа.

Такім чынам, паўтараем: наша задача складаецца ня толькі ў тым, каб забіць як мага больш ворагаў, але і ў тым, каб забясьпечыць сабе абарону як на час вайны за вызваленьне, так і далей, калі кампанія па выгнаньні брытанцаў скончыцца, і нашай адзінай мэтай стане ўсталяваньне дэмакратычнай сацыялістычнай рэспублікі.



Супраціў трэба арганізоўваць у формах актыўнай і пасыўнай падтрымкі, адначасова з тым праводзячы акцыі, займаючыся адукацыйнымі праграмамі і палітыкай; нам трэба арганізоўваць склады зброі ў хатах нашых пасыўных прыхільнікаў, навяртаць насельніцтва ў актыўных чальцоў Руху, даручаць распаўсюджаньне прэсы і г.д., з тым, каб пабудаваць паміж сабою і ворагам ахоўныя бар'еры, тым самым прадухіляючы спробы ізаляваць нас. Безумоўна, чым больш бар'ераў мы пабудуем, тым складаней ворагу будзе нас захапіць; мы ж у гэты час павялічым патэнцыял актыўнай падтрымкі ў розных формах.

Бар'еры першай неабходнасьці для нас - уласная бясьпека, іншых галін Руху, памяшканьняў і інш. Аднак нам разам з тым, неабходна ўмешвацца ў тыя сфэры, якія пацярпелі ў выніку вайны і зрабіліся акупаваныя ворагам: паліцыя, транспарт, вываз сьмецьця, кансультацыйныя цэнтры і г.д., каб у спрыяльных для нас абласьцях заваяваць як мага большы лік прыхільнікаў. Альтэрнатыва ясная: калі, напрыклад, у нейкім раёне дзейнічае адзінае падраздяленьне I.R.A. і няма ні камітэтаў Шынн Фэйн, ні Зялёнага крыжа, ні падтрымкі мясцовага насельніцтва, то празь нейкі час незалежна ад таго, наколькі пасьпяховыя дзеяньні гэтага падраздяленьня, яго чальцы апынуцца за кратамі без далейшых пэрспэктываў арганізацыі супраціву, вэрбоўкі, падрыхтоўкі альбо павелічэньня агульнай грамадзкай падтрымкі.

# ЧАСТКА II: АНТЫ-ДОПЫТАВАЯ ТАКТЫКА

## *Арышт*

Большасьць добраахвотнікаў падвяргаюцца арышту падчас або ў выніку ваеннай апэрацыі. Гэта выклікае ў іх першасны шок, які выяўляецца ў пачуцьці унутранай напружанасьці і страху. Усе добраахвотнікі, якія патрапілі ў палон думаюць, што яны праваліліся, і гэта выклікае ў іх пачуцьцё глыбокай расчараванасьці. Паліцыі вядома аб гэтым пачуцьці, і яна паспрабуе скарыстацца гэтай слабасьцю, гаворачы такія абразы, як "ня вельмі ж добра ты сябе паказаў", "ды ты ўсяго толькі аматар, а мы ж думалі, што маем справу з прафэсіяналамі", "ты тэрарыст другога гатунку" і г.д.

Падчас арышту паліцыя выкарыстоўвае грубую тактыку "шакаваньня" для таго, каб запалохаць арыштаванага і зламаць ягоны супраціў. Арыштаванага звычайна валакуць уздоўж вуліцы да паліцэйскага фургону, шпурляюць унутр, а ўсьлед за ім ускокваюць паліцыянты або брытанскія жаўнеры, якія выконвалі арышт. Па дарозе да турмы арыштаванага штурхаюць нагамі, і пачынаюцца абразы. Па прыбыцьці на месца яго поцягам выцягваюць з машыны, даюць штурхялёў, б'юць і абражаюць - і кідаюць у камэру.

Што павінен рабіць добраахвотнік пры арышце.

1. Найважнейшае - калі цябе арыштуюць, трэба памятаць, што ты – добраахвотнік рэвалюцыйнага войска, што цябе ўзялі ў палон варожыя сілы, што твая справа правая, а ў

ворага – не, і што ты – жаўнер, які ўзяў на сябе рызыку, чаканую для жаўнера, і няма нічога ганебнага ў тым, каб быць узятым у палон.

2. Ты заўсёды павінен памятаць, што тыя мэтады апрацоўкі, якія падрыхтаваныя для цябе, нацэленыя на тое, каб цябе зламаць і выцягнуць зь цябе па кроплі ўсю інфармацыю, якой ты можаш валодаць, у дачыненьні да той арганізацыі, якую ты прадстаўляеш.

3. Яны будуць спрабаваць запалохаць цябе адной нават сваёй колькасьцю і жорсткасьцю. Тыя барацьбіты-добраахвотнікі, у якіх арышт абудзіць пачуцьцё ўласнай непаўнавартасьці, уваходзяць у першую небясьпечную стадыю, бо паліцыя скарыстаецца гэтым пачуцьцём для іх паслабленьня і дасягненьня сваіх мэт. Рэвалюцыянэры павінны ў думках рыхтаваць сябе ад пачатку сваёй дзейнасьці да таго, што яны могуць быць падвергнутыя арышту і што, калі яны будуць арыштаваныя, яны павінны чакаць для сябе самога горшага і быць гатовымі да гэтага.

## Допыт

Пасьля таго, як арыштаванага зьмяшчаюць у камэру, яго могуць на некаторы час пакінуць яго ў адзіноце. Падчас гэтае паўзы афіцэры паліцыі, якія будуць дапытваць, час ад часу зьбіраюцца за дзьвярыма камэры, выкрыкваючы пагрозы і абразы, намякаючы арыштаванаму на тое, што яны зь ім зробяць, калі нарэшце ўвойдуць у камэру.

Празь некаторы час "сьледчыя" ўваходзяць у камэру і патрабуюць ад арыштаванага зрабіць чыстасардэчнае прызнаньне. На працягу гэтага пэрыяду ён можа падвяргацца зьбіваньню і слоўным абразам, у залежнасьці ад таго, пры якіх акалічнасьцях ён быў арыштаваны. На гэтай стадыі ў яго возьмуць адбіткі пальцаў, і яму будуць зададзеныя іншыя пытаньні, зьвязаныя з тым, якія высоўваюцца супраць яго абвінавачаньні. Звычайна запісваюць ягонае імя і адрас, месца працы і род заняткаў, адукацыю і гэтак далей. Пасьля гэтага яго зноў пакінуць у ізаляцыі ў камэры, на той час, пакуль "сьледчыя" правяраюць яго асобу, звычайна спраўджваючы зьвесткі з файламі мясцовай паліцыі, зь яго роднымі і зь месцам ягонай працы.

У гэты пэрыяд паліцыя паспрабуе ўсталяваць ягоныя палітычныя погляды, калі яны ў яго ёсьць, яго таварышаў, ці маюцца на яго дадзеныя ў паліцыі, - і такім чынам, завесьці справу. Зразумела, што кола яго таварышаў і яго звычайныя перамяшчэньні дадуць паліцыі добрае уяўленьне аб тым, ці ўлучаны ён у барацьбу або ці сымпатызуе ён палітычнай арганізацыі. Узброеная такой інфармацыяй, паліцыя ізноў увойдзе ў камэру і пачне вінаваціць добраахвотніка ва ўсялякага роду дзейнасьці. Калі існуючых доказаў недастатковыя для прад'яўленьня пэўных абвінавачаньняў, яму прад'явяць рознага роду туманныя абвінавачаньні.

Мэта такіх туманных абвінавачаньняў – выклікаць у зьняволенага пачуцьцё віны. Аднак калі ў паліцыі ёсьць нейкія пэўныя доказы або моцныя падазрэньні, якія лучаюць яго з пэўнай справай, то ціск на яго будзе аказаны неадкладна. Гэты ціск прыме форму фізычных і псыхалягічных катаваньняў, хутчэй за ўсё, яго будуць біць кулакамі і штурхялямі і шпурляць па ўсёй камэры, крыкамі патрабуючы ад яго прызнаньняў, паказваючы яму на тое, што "ім усё вядома". Адзін або некалькі з афіцэраў, якія ўдзельнічаюць у допыце, будуць дзейнічаць асабліва па-грубіянску. Калі ім не атрымаецца займець прызнаньне, яны пакінуць камэру, заявіўшы зьняволенаму, што яны яшчэ вернуцца, і пагражаючы яму самымі барбарскімі формамі катаваньняў, намякаючы на тое, што яны дамагаліся прызнаньняў і не ад такіх, як ён.

У камэру увойдзе іншая група "сьледчых", магчыма, з папкай са справай, на якой напісана імя зьняволенага. Яны будуць паводзіць сябе прыязна і выяўляць да яго сымпатыю і спагаду, гаворачы яму аб тым, што яны не ўхваляюць дзеяньняў папярэдняй групы, што іх калегі "зусім з глузду зьехалі", "пэўна, напіліся", і што так і забіць яго нядоўга, калі тыя яшчэ вернуцца. Яны будуць старацца з усіх сіл зрабіць прыемнае ўражаньне на зьняволенага, упэўніць яго ў сваёй

да яго сымпатыі, і папросяць яго зрабіць ім прызнаньне, намякнуўшы на тое, што ім бы не хацелася, каб за яго ізноў узяліся папярэднія афіцэры.




Яны, хутчэй за ўсё, будуць абяцаць яму, што калі ён прызнаецца, яны больш не дазволяць першай групе афіцэраў вярнуцца ў яго камэру. Гэта будзе суправаджацца папярэджаньнем, што ў адваротным выпадку, яны ня змогуць гарантаваць яму бясьпекі. Калі зьняволены адмовіцца рабіць прызнаньне, яны будуць паводзіць сябе так, нібы моцна расчараваліся ў ім і раздражнёныя ягоным нежаданьнем супрацоўнічаць. Яны могуць стукнуць яго па твары або ў жывот, гаворачы яму, што ён павінен бы быць ім удзячным, што яны выратавалі яго ад папярэдняй групы, паказваючы на тое, што яго паводзіны – праява няўдзячнасьці за іх такія добрыя адносіны.

Затым яны адкрыюць яго дасье, якое яны прынесьлі з сабой, і будуць прыкідвацца, што чытаюць урыўкі зь яго, зьвязаныя з жыцьцём і дзейнасьцю зьняволенага ў мінулым; нават самыя інтымныя і асабістыя аспэкты яго жыцьця будуць зачытаныя яму, і, магчыма, агульнае апісаньне кола яго сяброў і ягоных перамяшчэньняў. Вялікая частка гэтай інфармацыі можа зыходзіць ад яго сяброў, працадаўцы, школы, родных або каханай, гэта таксама можа быць вынікам "балбатні ў бары", мясцовых плётак, інфармацыі, атрыманай ад стукачоў або выціснутай зь іншых зьняволеных. Гэтая дэталёвая інфармацыя прызначаная для таго, каб напалохаць зьняволенага і пахіснуць у ім веру ў сваіх сяброў і ў сваю арганізацыю. Аднак калі яны не дасягнуць прызнаньня і на гэтай стадыі, яны пакінуць камэру, але спачатку яны назавуць зьняволенаму свае імёны і скажуць яму, што ён заўсёды можа іх паклікаць, калі яму будзе трэба, намякаючы на тое, што тыя, хто прыйдзе за імі, будуць шалёнымі, п'янымі і нанясуць сур'ёзную шкоду яго здароўю. Пасьля гэтага яны сыйдуць.

Праз некаторы час у камэры зьявіцца новая група "сьледчых", якія зноў-ткі будуць вельмі грубіянскімі і жорсткімі зь ім. Яны неадкладна накінуцца на яго самым жорсткім спосабам, намякаючы на тое, што калі ён яшчэ дагэтуль не прызнаўся, то ўжо яны-то выцягнуць зь яго ўсё. Яны распавядуць яму аб тым, якой катаўскай рэпутацыяй яны карыстаюцца, і што яшчэ нікому не ўдавалася вырвацца ад іх, не зрабіўшы прызнаньня. Катаваньні, якія ўжываюць на гэтым этапе, будуць мець патройную структуру:

1. Фізычныя катаваньні.
2. Тонкія псыхалягічныя катаваньні.
3. Зьневажаньне.

1. Фізычныя катаваньні.

Фізычныя катаваньні будуць ужывацца ў такіх формах, як зьбіцьцё кулакамі, штурхялі, выкручваньне канечнасьцяў і нават тушэньне цыгарэт аб зьняволенага.

2. Тонкія псыхалягічныя катаваньні.

Яны будуць у форме пагрозаў у адрас родных, сяброў і яго самога, гэта значыць, напрыклад, пагрозы забіць, пагрозы кастрыраваць.

3. Зьневажаньне.

Яно прымае форму зрываньня са зьняволенага ўсёй вопраткі і камэнтароў у адрас яго палавых органаў. Гэты пэрыяд допыту можа доўжыцца да двух гадзін і больш, і ў канцы яго яму пад нос могуць ткнуць сапраўднае або падробленае прызнаньне аднаго зь яго сяброў. Калі і пасьля гэтага яны не даб'юцца прызнаньня, яны пакінуць камэру, абяцаючы вярнуцца, і што калі яны вернуцца, ва ўсім целе ў яго не застанецца ніводнай цэлай костачкі.

Гэты працэс можа ісьці цягам 7 дзён (па законе, папярэдняе затрыманьне ў Паўночнай Ірляндыі ў той пэрыяд не магло быць больш за 7 дзён), без перапынку, на сон вылучаецца мінімум часу, або наогул не вылучаецца, у залежнасьці ад таго, ці здасца ім гэта неабходным. Недахоп сну дэзарыентуе зьняволенага. З-за дзеючых законаў, якія дазваляюць паліцыі трымаць арыштаванага ў ізалятары папярэдняга заключэньня цягам 7 дзён, на практыцы гэта азначае, што працэс допыту можа працягвацца ўвесь гэты час, з мэтай дэзарыентацыі ахвяры з-за адсутнасьці сну.

Допыт можа мець мноства розных стадый, у залежнасьці ад доказаў або зьвестак, якія сабрала паліцыя. Зразуемела, што добраахвотнік, захоплены падчас правядзеньня апэрацыі, аўтаматычна разглядаецца як вінаваты, асабліва калі ён быў схоплены са зброяй альбо бомбай - у такім разе ў паліцыі ўжо ёсьць усе неабходныя доказы для вынясеньня прысуду, і допыт становіцца непатрэбным. У такіх выпадках добраахвотніка будуць зьбіваць за тое, што ён зрабіў, а не за тое, што ён ведае. Калі яго ў такім разе ўсё ж дапытваюць, то гэта робіцца дзеля інфармацыі аб той арганізацыі, да якой ён належыць, і аб яго таварышах.

Іншы ценявы аспэкт, непасрэдна зьвязаны з допытамі, - гэта шантаж і хабар. Калі паліцыя ня можа дабіцца прызнаньні, яна можа паспрабаваць шантажаваць добраахвотніка, напрыклад, у форме пагроз распаўсюдзіць аб ім скандальныя чуткі, якія наносяць удар па ягонай рэпутацыі, або расказаць ягоным таварышам, што ён здрадзіў ім і ўсё распавёў, або што ён ужо шмат гадоў працуе на ворага. Іншая фаза такога ценявога допыту - гэта хабар. Добраахвотніку могуць быць прапанаваныя грошы, пашпарт і праезд у любую краіну сьвету, калі ён пагодзіцца супрацоўнічаць са сьледзтвам.

## *Допыт: аналіз*

Самая лепшая абарона з таго, што прапаноўвае антыдопытавая тактыка, - гэта разуменьне той тактыкі, якую выкарыстоўвае паліцыя.

Мэта допыту - дабіцца прызнаньня. Калі б "сьледчыя" ўжо ведалі тое, што ім трэба, тады не было б патрэбы ў допыце; такім чынам, допыт неабходны толькі тады, калі паліцыі не вядомая інфармацыя, якая прывяла б да афіцыйнага абвінавачаньня.

Самая лепшая антыдопытавая мера – не гаварыць наогул нічога, ні слова. Усё, што ёсьць у паліцыі ў іх працы, - гэтае падазрэньні або ўскосныя сьведчаньні, так што калі добраахвотнік арыштаваны, яны стараюцца пабудаваць справу на падставе гэтых сваіх падазрэньняў, і адзіны шлях, якім яны могуць гэтага дасягнуць, - гэтае атрыманьне інфармацыі ад сваёй ахвяры.

Яны звычайна пачынаюць з допыту затрыманага, запісваючы ўсё, што ён гаворыць, параўноўваючы гэтую інфармацыю з той, якая ўжо маецца ў іх распараджэньні, шукаючы супярэчнасьці ў гэтай новай інфармацыі, якія аспрэчваюць тыя дадзеныя, што ўжо былі сабраныя раней, вяртаючыся да сваёй ахвяры і паказваючы ёй на гэтыя супярэчнасьці - што вядзе да таго, што ахвяра ўносіць зьмены ў сваё алібі, з тым, каб падбудавацца і згладзіць гэтыя супярэчнасьці. Паліцыя зноў праверыць гэтую новую гісторыю, параўноўваючы яе зь іншай інфармацыяй, зноў у пошуках адрозьненьняў або памылкі, усё больш і больш звужаючы

алібі добраахвотніка, пакуль яно, нарэшце, не паваліцца. Усе гэтыя зьмены, унесеныя ім у свае сьведчаньні, запісаваюцца і будуць скарыстаныя як доказы супраць яго, доказы, якія без найменшых сумневаў будуць прынятыя судом, і прывядуць такім чынам да вынясеньня яму абвінаваўчага прысуду. Таму мы не стамляемся паўтараць : НЕ ГАВАРЫ ІМ НІЧОГА. Патрабуй, каб да цябе неадкладна прывялі адваката і дактара - і працягвай дамагацца гэтага ўвесь час.



НЕ ЎСТУПАЙ У ГУТАРКІ З ПАЛІЦЫЯЙ.

Мы ўжо паказалі раней у нашай лекцыі, як, пасьля таго, як арыштаваны быў зьмешчаны ў камэру, паліцыянты падыходзілі ў дзьвярэй, выкрыкваючы абразы і грукаючы па ёй. Мэта гэтага практыкаваньня - запалохаць арыштаванага і выклікаць у ім пачуцьцё панікі. Калі ўзьнікае паніка, усе натуральныя, рацыянальныя ахоўныя бар'еры альбо ламаюцца, альбо слабеюць. Калі гэта адбываецца, зьняволены губляе разважлівасьць і становіцца лягчэйшай здабычай на допыце. Іншымі словамі, чалавек, які запанікаваў, лягчэй паддаецца запалохваньням "сьледчых", чым чалавек халодны і разважлівы.

У той час, пакуль ён сядзіць у адзіноце ў сваёй камэры, зьняволены мусіць настолькі, наколькі гэта магчыма, ігнаруючы паводзіны паліцыі за дзьвярыма, яе пагрозы і абразы, сабраць у думках усе факты вакол свайго арышту, якія яму вядомыя. Ён павінен памятаць, што без абвінавачаньня яго не могуць затрымаць больш, чым на 7 дзён, і ён павінен заўсёды памятаць наступнае: **або зьняволеньне і допыты з катаваньнямі на працягу 7 дзён, калі ён будзе маўчаць, - або, магчыма, доўгія гады ў турме, калі ён загаворыць.**

Шматлікія арыштаваныя пачынаюць размаўляць з пачуцьця страху, памылкова думаючы, што калі яны загавораць, катаваньні ня будуць да іх ужывацца. Вядомы факт – што "сьледчыя" кіруюцца простым правілам: "Калі зьняволены не гаворыць, магчыма, ён невінаваты, а допыт можа быць пустым марнаваньнем часу. Калі ён трохі гаворыць, то ён заўсёды ведае яшчэ больш, і допыт неабходны." У сілу гэтага цьверджаньня зьняволены, які гаворыць са "сьледчымі" хоць трохі, для таго, каб прадухіліць дрэннае з сабою абыходжаньне, на самой справе толькі правакуе іх абыходзіцца зь ім яшчэ горш, бо "сьледчыя" заўсёды будуць меркаваць, што ён яшчэ ня ўсё распавёў.

У сілу гэтага самая лепшая абарона- заставацца СТРЫМАНЫМ, САБРАНЫМ, СПАКОЙНЫМ, - І НЕ ГАВАРЫЦЬ НІЧОГА НАОГУЛ.

Мы ўжо паказалі ў нашай лекцыі, як першая партыя "сьледчых", звычайна ўрываецца ў камэру з крыкамі, абразамі, пачынаюць зьбіваць зьняволенага. Добраахвотнікі павінны разумець, што гэтая першая група, як правіла, здымае адбіткі пальцаў, пытае затрыманага яго імя, адрас, і таму падобнае... На гэтай стадыі мала вядома аб арыштаваным, і ў сілу гэтага задача першай групы - пазытыўна ідэнтыфікаваць яго. Зноў-ткі, добраахвотнік павінен памятаць, што ўсё, што ён скажа, будзе запісана і потым параўнана з той інфармацыяй, якая ўжо маецца ў распараджэньні паліцыі.

Мэта абразаў у адрас арыштанта на гэтай стадыі завецца "пэрыяд разьмякчэньня"; звычайна адзін або некалькі "сьледчых" будуць асабліва грубіянскімі і жорсткімі. Гэты пэрыяд допыту звычайна доўжыцца ня больш аднае гадзіны і на практыцы зьяўляецца толькі папярэднім

расьсьледаваньнем. Мэта выкарыстаньня тактыкі ўжываньня грубіянскай фізычнай сілы і чыстай вады нянавісьці - у падрыхтоўцы арыштаванага да зьяўленьня новай партыі "сьледчых", якія, як мы бачылі, дзейнічаюць так, нібы яны вельмі спачувальна да яго ставяцца.

Гэтая група "сьледчых", як мы бачылі, дзейнічае прыязна ў дачыненьні да зьняволенага, прапануючы яму цыгарэты і сяброўства. Добраахвотнікі павінны выразна ўсьведамляць, што адбываецца, і не даваць волі пачуцьцям у адрас гэтага ілжэ-сяброўства. Гэтыя "сьледчыя" прыкідваюцца, нібы сымпатызуюць мэтам і задачам нашага руху, удаюцца ў дэталі, абы зрабіць уражаньне на добраахвотніка, прыкідваючыся, што яны таксама вераць у ідэю аб'яднаньня Ірляндыі.

Без сумневу, яны распавядуць добраахвотніку аб тым, што іх бацька або дзядуля таксама быў у шэрагах нашай арганізацыі, і што эканамічныя ўмовы вымусілі іх пайсьці на працу ў паліцыю, а зараз яны ўсяго толькі праводзяць час на працы, у чаканьні таго, калі ім можна будзе сыйсьці на пэнсію. Яны пастараюцца ўпэўніць добраахвотніка ў тым, што гэта ў ягоных уласных інтарэсах – прызнацца; што яны раяць яму прызнацца ім, каб пазьбегнуць наступнага сутыкненьня з папярэдняй брыгадай афіцэраў, якія, як яны скажуць, адносяцца вельмі варожа да рэспубліканцаў, і якіх цікавіць не прызнаньне само па сабе, а тое, як бы больш балюча яго зьбіць.

Добраахвотнік павінен разумець, што тыя самыя такія добранькія з выгляду афіцэры паліцыі могуць у дачыненьні да ягоных таварышаў гуляць ролю як раз гэтых грубіянскіх і жорсткіх "следчых".



Нарэшце, мы бачылі, як гэтыя "сьледчыя", прыкідваючыся, што яны засмучаныя, б'юць добраахвотніка па твары і па целе, заяўляючы, што за іх параду і за іх сяброўства ім плацяць дурной упартасьцю і адмовай зрабіць НАВАТ ЧАСТКОВАЕ прызнаньне. Гэтая тэхніка допытаў – старая, як прафэсія паліцыянтаў, яны спрабуюць заваяваць сяброўства і сымпатыі зьняволенага, спадзеючыся, што калі ён патрапіць на іх вуду, то ён будзе засмучаны, ня столькі з-за ўдару па твары, які ён ад іх атрымаў, колькі з-за сваёй уласнай адмовы супрацоўнічаць: магчыма, гэта адна з самых небясьпечных тэхнік, што ўжываюцца на допытах, бо яна ставіць затрыманага ў псыхалягічна пройгрышнае становішча.

Іншая схема допытаў – так званая тактыка "Асабліва сакрэтнай справы". Яна выяўляецца ў прынясеньні "сьледчымі" ў камэру тоўстай папкі з надрукаваным імем самога зьняволенага на ёй. Як мы ўжо раней паказалі ў лекцыі, паліцыянты раскрыюць гэты файл у прысутнасьці зьняволенага. Яны пачнуць зачытваць аб ягоным мінулым жыцьці з папкі, аж да самых інтымных дэталяў, плюс агульнае апісаньне ягоных сяброў і ягоных перамяшчэньняў за апошні час, робячы адмысловую ўвагу на тых, хто вядомы як асобы, якія маюць кантакты або якія сымпатызуюць палітычнай арганізацыі, гэта значыць, Шынн Фэйн. У іх таксама ёсьць інфармацыя, сабраная з розных крыніц, уключаючы суседзяў, працадаўцы, гутаркі ў барах або мясцовыя плёткі. Вельмі часта гутаркі ў барах або мясцовыя плёткі адпавядаюць рэчаіснасьці, бо іх крыніцай зьяўляецца сам добраахвотнік або іншыя добраахвотнікі, якія размаўлялі ў бары пад уплывам алькаголю, з бравадай апавядаючы сябрам ці каханай дзяўчыне аб сваіх

подзьвігах і подзьвігах іншых. Такі тып бравіраваньня, цалкам зразумела, сьмяротна небясьпечны, ня толькі для самога добраахвотніка і яго блізкіх таварышаў, але і для руху ў цэлым.

Іншы небясьпечны аспэкт допыту - так званае "прызнаньне твайго сябра", гэта ўключае ў сябе дэманстрацыю добраахвотніку "сьледчымі" падпісанага або не падпісанага, сапраўднага або фальшывага прызнаньня аднаго зь яго сяброў. Па-першае, добраахвотнікі павінны разумець, што такое прызнаньне можа быць фальшыўкай, а па-другое, нават калі гэта сапраўды прызнаньне аднаго зь яго сяброў, гэтае прызнаньне - яшчэ ня доказ віны, і яно ня будзе прынята ў судзе, калі той, хто зрабіў яго, не паўторыць свае сьведчаньні ў судзе пад прысягай. Даволі часта добраахвотнік можа не вытрымаць фізычных і эмацыйных катаваньняў і дасьць нейкія сьведчаньні, але мала хто адважыцца паўтарыць іх у судзе супраць сваіх таварышаў. Калі паліцыя выкарыстае такую тактыку, не паддавайся ёй. Гэта - вядомы трук для таго, каб прыслабіць волю добраахвотніка і вымусіць яго падпісаць прызнаньне.

Іншая небясьпечная тэхніка, што выкарыстоўваецца падчас допыту, - прывесьці зьняволенага, даўшага сьведчаньні, у той жа пакой, дзе знаходзіцца той, хто адмаўляецца супрацоўнічаць з паліцыяй. Іх звычайна пакідаюць сам-насам, і той, хто даў сьведчаньні, можа паспрабаваць угаварыць свайго таварыша зрабіць тое ж самае. Калі такое здарыцца з табой, памятай, што вы не адныя, што камэра праслухоўваецца, і што ўсё, аб чым вы гаворыце, запісваецца. Іншая важная рэч, якую трэба памятаць, - калі такі зьняволены паспрабуе з табой гаварыць, не накідвайся на яго з лаянкай, бо твая лаянка пацьвердзіць тваю віну. Заўсёды гавары зь ім прыязна, скажы яму, што ён памыліўся, што ён, напэўна, хворы, і парай яму паклікаць лекара.

Яшчэ адзін надзвычай важны пункт, які заўсёды неабходна памятаць, - НЕ ЎСТУПАЙ У ПАЛІТЫЧНЫЯ ДЫСКУСІІ. Гэтая тэхніка - унівэрсальная і шырока выкарыстоўваецца і па сёньняшні дзень. Калі добраахвотнік адмаўляецца зрабіць прызнаньне, і калі ніводная іншая тактыка не дапамагае, паліцыя звычайна, калі не заўсёды, падштурхоўвае зьняволенага да гутаркі на палітычныя тэмы. Гэтую тэхніку шматлікія добраахвотнікі не распазнаюць своечасова, яе мэта - зьбіць добраахвотніка з балянсу, выявіць ягоныя палітычныя меркаваньні, разарваць яго маўчаньне - і такім чынам, падрыхтаваць яго да таго, каб яго "прарвала", і ён загаварыў свабодна. Гэтая тактыка часта выкарыстоўвалася супраць добраахвотнікаў - і вельмі часта прыводзіла да жаласных для іх наступстваў. Пасьля таго, як добраахвотнік падвергнуўся арышту, і звычайныя тэрарыстычныя прыёмы былі скарыстаныя супраць яго, такая нечаканая праява сяброўства аказывае на яго нейкае расслабляючае ўздзеяньне і цалкам тлумачыцца ў псыхалягічных тэрмінах.

Як мы ўжо раней паказвалі, перш чым. пакінуць камэру, падобныя "сьледчыя" паведамляюць зьняволенаму свае імёны, папярэджваючы яго, што тыя, хто прыйдзе за імі, - шалёныя анты-рэспубліканцы, якія някепска яго адкалашмацяць, што ён заўсёды можа паклікаць іх, калі яму будзе цяжка, і што яны зробяць усё ад іх залежнае, каб выратаваць яго ад жорсткага зь ім абыходжаньня. Усе добраахвотнікі павінны разумець - і разумець найясьнейшым чынам, - што ніводзін "сьледчы" ня можа быць іх сябрам, што яны - ворагі, прылада для скланеньня да супрацоўніцтва з ворагам, прылада падаўленьня, і што яны яшчэ больш значна небясьпечныя ворагі, чым тыя "сьледчыя", якія іх зьбіваюць.

Гэтыя людзі дзейнічаюць у рамках адведзенай ім ролі ў добра адрэпэтаванай гульні і выкарыстоўваюць тонкія псыхалягічныя прыёмы для падрыву маралі добраахвотніка. Усе добраахвотнікі добра знаёмыя з жорсткім абыходжаньнем, якое зыходзіць ад паліцыі і брытанскага войска. Яны разумеюць, што азначаюць фізычныя катаваньні, але зараз вам прыйдзецца навучыцца разумець, што такое катаваньні псыхалягічныя, і як яны ўжываюцца, Магчыма, гэты тэрмін для вас новы і нязвыклы, але ягоная эфэктыўнасьць вельмі і вельмі значная.

Далей, мы паказалі, як пасьля гэтага ў камэру зноў урываецца "узвод задзір" і адразу кідаецца ў жорсткую фізычную атаку на добраахвотніка. Гэтае шокавае абыходжаньне загадзя добра адрэпэтаванае і нацэлена на тое, каб загнаць зьняволенага ў псыхалягічны і фізычны кут; іншымі словамі, яны спадзяюцца на тое, што іх шокавае абыходжаньне пазбавіць добраахвотніка балянсу, канцэнтрацыі, і што ў такім стане ён прызнаецца. Яны будуць выкрыкваць нешта накшталт таго, што славяцца сваім уменьнем выбіваць зь людзей прызнаньні, што яшчэ нікому не ўдалося ад іх сысьці, не прызнаўшыся, і што ў яго не атрымаецца іх абдурыць. Зараз мы паспрабуем прааналізаваць такія паводзіны.



Першае, што важна адзначыць, - у параўнаньні зь фізычнымі катаваньнямі і ў спалучэньні зь імі такія вось выкрыкі на практыцы зьяўляюцца больш важнай тэхнікай допыту, чым катаваньні фізычныя. Так усё ж, навошта крычаць? Навошта выхваляцца? Навошта гаварыць добраахвотніку аб тым, што яны зьяўляюцца экспэртамі ў тым, як вывуджваць зь людзей сьведчаньні? Усе гэтыя крыкі і пахвальба перш усяго патрэбныя самым паліцыянтам,- як доказ таго, што яны ў рэчаіснасьці змогуць атрымаць прызнаньне; гэта - першая цалкам зразумелая прыкмета іх уласнай слабасьці, кампэнсаваньне іх уласных недахопаў і няўпэўненасьці ў сабе, і ўсе добраахвотнікі павінны глядзець на падобныя выкрыкі, як на сучасную вэрсію ваяўнічага танца перад бітвай. Сапраўды гэтак жа, як у даўнія часы прымітыўныя плямёны ладзілі ваяўнічыя скокі і ўсталёўвалі татэмы, каб кампэнсаваць для сябе пачуцьцё сваёй уласнай, ім самім вядомай слабасьці, сапраўды так жа і фрустраваныя паліцыянты будуць крычаць і біць сябе ў грудзі кулаком перад зьняволеным для кампэнсаваньня сваёй уласнай нутранай слабасьці. Самая лепшая антыдопытавая тэхніка, якую можа ўжыць добраахвотнік, які апынуўся ў такой сытуацыі, - гэта глядзець на "сьледчых" так, як бы ён глядзеў на першабытнае племя, што стаіць на прымітыўнай прыступцы разьвіцьця, чальцы якога, начапіўшы на сябе галаву забітай жывёліны, спадзяюцца, што такім чынам да іх пяройдзе сіла альбо хітрасьць гэтай жывёліны. Усе добраахвотнікі павінны глядзець на паліцыянтаў, што гарлаюць і хваляцца, так, як яны глядзелі б на прымітыўнае племя, якое выконвае ваяўнічы танец.

## *Псыхалягічныя катаваньні*

Мы ўжо паказвалі, што катаваньні такога роду шырака распаўсюджаныя і звычайна па форме ўяўляюць пагрозы ў адрас самога добраахвотніка, аб якім ідзе размова, ягоных сяброў і родных, пагрозы забіць яго, ачарніць ягоную рэпутацыю, кастрыраваць яго; пазбаўленьне сну, дрэнная ежа, няспынны шум. У спалучэньні зь фізычнымі мукамі і страхам перад фізычнымі катаваньнямі гэта вядзе да нагнятаньня страху і даводзіць да мяжы зь гістэрыкай. Усё гэта распрацавана для падаўленьня натуральнага ахоўнага мэханізму добраахвотніка, - як правіла, чалавека, якога трымаюць у зьняволеньні ўжо некалькі дзён, у атмасфэры страху і невядомасьці, які несупынна падвяргаецца пагрозам, адрэзаны ад усіх сваіх звычайных кантактаў, ад свайго звычайнага сацыяльнага асяродзьдзя, пазбаўлены сну, і таму падобнае... Гэта можа прывесьці і прыводзіць да стану дэзарыентацыі і расчараваньня; на працягу гэтага пэрыяду добраахвотнік будзе практычна пазбаўлены сну, і знаходжаньне ў такім стане на працягу некалькіх дзён можа пакінуць на человеку сваю засечку, чаму варта прысьвяціць асобную лекцыю.

ЗЬНЕВАЖАНЬНЕ

Мы бачылі, што гэты тып тэхнікі допытаў нязьменна выяўляецца ў распрананьні зьняволенага

дагала і рэпліках, якія адпускаюцца ў адрас яго палавых органаў. Добраахвотнікам павінна быць вядома, што цалкам даказаны факт: вопратка зьяўляецца важнай складовай часткай асобы чалавека. Зрываючы зь яго вопратку, "сьледчыя" спадзяюцца ліквідаваць такім чынам яго асобу, яго характар; у псыхалягічным пляне гэта сымбалічна, і здзяйсьняючы гэта, паліцыя імкнецца зьняважыць добраахвотніка і такім чынам разбурыць ягоныя ахоўныя псыхалягічныя бар'еры, бо менавіта гэтыя бар'еры не даюць ім дабіцца ад яго прызнаньня. Вопратка чалавека становіцца знакам гэтых бар'ераў, і зрываючы яе, яны спадзяюцца зьнішчыць такім чынам натуральны ахоўны мэханізм добраахвотніка.

Другая частка зьневажаньня праяўляецца ў выказваньні імі абразьлівых заўвагаў у адрас палавых органаў добраахвотніка. Гэта шырака распаўсюджаная зьява ў паліцэйскіх участках, як на поўначы Ірляндыі, так і на яе поўдні, гэтак і ў Ангельшчыне. Добраахвотнікі павінны паспрабаваць зразумець мэнталітэт, які ляжыць у аснове гэтых дзеяньняў, і такім чынам быць больш падрыхтаванымі да падобных актаў, калі гэта здарыцца зь імі. Такім чынам, калі яны зрываюць вопратку з добраахвотніка, якая сымбалізуе ягоны ахоўны мэханізм або натуральны бар'ер, гэтак жа і выказваньнем абразьлівых заўваг у адрас палавых органаў добраахвотніка яны спрабуюць зьняважыць яго і такім чынам аслабіць ягоную волю да супраціву. Гэты просты акт мае пад сабой глыбейшыя перадумовы, чым падаецца на першы погляд. Добраахвотнікі павінны разумець, што з псыхалягічнага пункта гледжаньня падобныя паводзіны завуцца "комплексам пэніса". Гэты комплекс уласьцівы гомасэксуалістам, і хоць самыя "сьледчыя" могуць быць жанатымі, мець дзяцей, гэта паказвае на ўтоеныя імі нутраныя гомасэксуальныя схільнасьці. Калі добраахвотнік зразумее і ўсьвядоміць гэты даказаны факт, яму ня будзе надта цяжка перамагчы сваіх катаў. Ён мусіць глядзець на іх як на гомасэксуалістаў зь імунітэтам, атрыманым ад дзяржавы, як на людзей, якія робяцца садыстамі з-за таго, што ў звычайным жыцьці яны вымушаныя прыкідвацца і душыць у сабе гомасэксуальныя парывы, якія ляжаць у аснове такіх паводзін.

Часам паліцыя спрабуе выкарыстаць шантаж і хабар ў апошняй адчайнай спробе дамагчыся прызнаньня. Усе добраахвотнікі павінны ігнараваць гэткае вывешваньне морквы перад носам. Шантаж рэдка бывае эфэктыўным і часьцяком можа нанесьці шкоду самой паліцыі, калі на яе пададуць у суд і зробяць гэта здабыткам галоснасьці. Хабар ніколі не спрацоўвае, нягледзячы на той факт, што добраахвотніку могуць быць прапанаваныя грошы і абарона ў абмен на інфармацыю. Ён павінен памятаць, што калі ён перастане быць карысным для паліцыі, яна яго кіне, а яе абарона на практыцы нічога не азначае. Добры таму прыклад - лёс Кэнэта Ленана (Ленан быў знойдзены застрэленым у канаве ў Ангельшчыне пасьля таго, як I.R.A. адшукала яго там).

Калі цябе жорстка катуюць фізычна, для добраахвотніка важна кансалідаваць сваю пазыцыю, важна памятаць, што гэта – 7 дзён, калі ён будзе маўчаць, і, магчыма, 17 гадоў, калі ён загаворыць. Нялёгка адмахнуцца рукой ад фізычных катаваньняў, як чагосьці малазначнага. Для таго, каго катуюць, гэта зусім ня дробязь, і зусім не малазначная. Ад спрадвечных часоў, калі пачала запісвацца чалавечая гісторыя, пачынаючы з Бабілёнскае імпэрыі, імпэрскага Рыма, гішпанскае інквізыцыі і да нацысцкіх канцэнтрацыйных лягероў, Вольнай Дзяржавы (маецца на ўвазе Ірляндзкая Рэспубліка) і да брытанскіх паліцэйскіх участкаў да нас даходзяць сьведчаньні аб тым, як людзі спраўляліся з мукамі і перамагалі паліцыю, якая спрабавала выбіць зь іх інфармацыю.

Адна характэрная тэхніка засноўваецца на здольнасьці зьняволенага маляваць карціны ў сваім уяўленьні або на супрацьлеглых сьценах. Людзі, якіх катавалі, уяўлялі, што накіроўваюць сваю моц канцэнтрацыі далей ад "сьледчых" і пераводзяць яе на стварэньне ўяўных малюнкаў у розуме, і тады яны маглі эфэктыўна пераадольваць фізычны боль. Некаторыя людзі малявалі ва ўласным уяўленьні або перад вачыма такія карціны, як запаленую сьвечку, ліст або кветку, і канцэнтруючыся на іх, будуючы іх у сваіх думках, стабілізуючы гэты малюначак, яны дамагаліся такой моцнай канцэнтрацыі на гэтым, што на практыцы фізычныя катаваньні такіх

людзей рабіліся бессэнсоўнымі. Гэтае разумовае практыкаваньне завецца некаторымі псыхолягамі "перавага розуму над целам" і, як кажуць, зьяўляецца вельмі пасьпяховай і пераможнай тэхнікай для барацьбы з допытамі.

Невядомыя законы, на якіх гэтая тэхніка будуецца, але ўсе, хто займаўся яе дасьледаваньнем, падкрэсьліваюць, што людзі, якія знаходзяцца пад вялізным фізычным і псыхалягічным ціскам, аказваюцца здольнымі прыстасавацца да яго. Тыя, у каго не было папярэдняга досьледу або веданьня гэтага прадмета, але падчас допыту паспрабавалі ўжыць гэтую тэхніку на практыцы, пацьвярджаюць, што яна спрацоўвае, хоць і не маглі растлумачыць, чаму.

Іншыя знаходзяць, што, вылучыўшы нейкае вызначанае месца на сьцяне і сканцэнтраваўшыся на ім, яны таксама атрымлівалі падобныя адчуваньні. Магчыма, што гэта нешта блізкае да старажытнай індыйскай практыкі ёгі, але цалкам несумненна адно: калі канцэнтрацыя зьняволенага накіраваная прэч ад "сьледчых", ён аказваецца здольным перамагчы іх, і, магчыма, мука – гэта мэтад, пры дапамозе якога паліцыя стараецца сканцэнтраваць ягоную ўвагу на іх самых. Гэтая парада павінна прынамсі ўлічвацца добраахвотнікамі.

Нарэшце, у зьняволеньні, пры арышце:
НІЧОГА НЕ ГАВАРЫ, НІЧОГА НЕ ПАДПІСВАЙ, НІЧОГА НЯ БАЧ, НІЧОГА НЯ ЧУЙ.

Адна з сучасных тэхнік, што ўжываецца брытанцамі і паліцыяй, накіраваная на выкліканьне псыхалягічнага шоку. Гэта ўключае ў сябе паказваньне павялічаных фотаздымкаў, звычайна – ахвяр выбухаў бомб, забітых жаўнераў і паліцыянтаў, і вельмі часта – забітых таварышаў добраахвотніка. Мэта такой тактыкі – выклікаць эмоцыі гістэрыкі ў падазраванага і такім чынам часова яго дэзарыентаваць. Усе добраахвотнікі павінны разумець гэта і ўсьведамляць тое, які шок, жах і гістэрыку гэта можа выклікаць у безабароннага чалавека.



Разумеючы гэтую тэхніку і аналізуючы яе зь лягічнага пункта гледжаньня, а таксама ўлічваючы тактыку, якая хаваецца за ёй, добраахвотнікі павінны быць гатовымі да сустрэчы з падобнай сытуацыяй ва упэўненасьці, што яе мэтай зьяўляецца шакаваньне добраахвотніка да такой ступені, каб вырваць у яго прызнаньне. Іншая тактыка падобнага характару выяўляецца ў падкідваньні адарваных канечнасьцяў трупа ў камэру зьняволенага. Найлепшым досьведам гэтай тактыкі зьяўляецца ягонае адзінае пасьпяховае выкарыстаньне ў выпадку з Miami Showband [Чальцы Miami Showband, папулярнай музычнай групы з Рэспублікі, былі забітыя падчас хвалі сэктанцкіх забойстваў у Armagh ў сярэдзіне 1970-х ваяўнікамі UVF. Тры чальцы гэтае групы былі забітыя і два скалечыныя. Два чальца UVF загінулі ў момант спробы падрыву аўтобуса групы, калі яны спрабавалі зьнішчыць аўтобус і целы з дапамогай бомбы.]

Найлепшая абарона падчас допыту – АДДАНАСЬЦЬ нашаму руху. Гэта азначае АДДАНАСЬЦЬ сваім таварышам і АБАРОНУ ўсіх удзельнікаў руху. Зноў-ткі, адданасьць мэтам і задачам руху, глыбокая і непахісная ПАЛІТЫЧНАЯ АДДАНАСЬЦЬ ідэям сацыялістычнай рэспублікі, НЕРУХОМАЯ ЎПЭЎНЕНАСЬЦЬ у тым, што ты – РЭВАЛЮЦЫЯНЭР, з сур'ёзнай ПАЛІТЫЧНАЙ базай, ШЛЯХЕТНАЙ І СПРАВЯДЛІВАЙ СПРАВАЙ, і глыбокай і непахіснай верай у тое, што тыя, хто арыштаваў і дапытвае цябе, МАРАЛЬНА НЕПРАВЫЯ, і што ты ПЕРАЎЗЫХОДЗІШ іх ва ўсіх адносінах, таму што твая справа - ПРАВАЯ І НЕПЕРАМОЖНАЯ.

# ЧАСТКА III: ПРАЦЭДУРА ВАЕННАГА ТРЫБУНАЛА I.R.A.

1. Ваенны Трыбунал склікаецца Кіраўніком Трыбунала: камандным афіцэрам (O.C.) любога Падразьдзяленьня або Камандуючым па кадрах (C.S.), каб судзіць любога Добраахвотніка па прад'яўленным абвінавачаньні або абвінавачаньнях.

2. Трыбунал павінен складацца з трох чальцоў роўнага званьня або вышэй, чым абвінавачаны.

3. Кіраўнік Трыбунала прызначае аднаго чальца Трыбунала Прэзыдэнтам.

4. Калі Ваенны Трыбунал скліканы камандным афіцэрам Падразьдзяленьня, Ад'ютант Падразьдзяленьня, або некаторы чалец Падразьдзяленьня, дэлегаваны Ад'ютантам Падразьдзяленьня, будзе дзейнічаць з боку Абвінавачаньня на судовым паседжаньні. Калі Кіраўнік Трыбунала – Камандуючы па кадрах, ён можа прызначыць любога афіцэра акрамя Генэрал-ад'ютанта, каб дзейнічаць з боку Абвінавачаньня на судовым паседжаньні.

5. Абвінавачаны можа зьвярнуцца да любога Добраахвотніка з просьбай дзейнічаць, як ягоны абаронца, або, калі ён пажадае, можа абараняць сябе сам.

6. Копія абвінавачаньняў павінна быць прад'яўлена абвінавачанаму ў разумны час перад слуханьнем справы, каб дазволіць яму падрыхтаваць абарону. Кіраўнік Трыбунала можа або прадставіць абвінавачанаму зьмест справы, якую прапанавана разгледзець Трыбуналу, або склікаць папярэдняе слуханьне, на якім сьведкі дадуць прысягу наконт сваіх сьведчаньняў. Пры такім папярэднім слуханьні, ні абарона, ні абвінавачаньне не будзе прысутнічаць, але абвінавачаны можа падвергнуць крыжаванаму допыту сьведак. Сьведчаньне павінна быць зьнята ў пісьмовай форме ад кожнага сьведкі, прачытана і падпісана ім. Калі абвінавачаны жадае зрабіць заяву або сьведчыць пад прысягай, яго трэба перасьцерагчы, што ўсё, што ён будзе гаворыць, можа быць запісана і выкарыстана на наступных слуханьнях.

7. Калі абвінавачаны заяўляе недавер да любога з трох афіцэраў, уключальных у Трыбунал, яго заява будзе дасьледавана астатнімі двума чальцамі, і пры наяўнасьці згоды, заяўлены афіцэр будзе заменены.

8. Кіраўнік Трыбунала мусіць упэўніцца, што абвінаваўчы бок валодае ўсімі фактамі, датычнымі справы і што ўсе сьведкі па справе прысутнічаюць на Трыбунале.

9. Кіраўнік Трыбунала забясьпечвае Трыбунал копіяй абвінавачаньня і копіямі Агульнавайсковых Распараджэньняў.

10. Падчас слуханьня справы, усе сьведкі зьбіраюцца ў асобным пакоі па запыце Трыбунала. На самым Трыбунале павінны прысутнічаць толькі чальцы Трыбунала, абвінавачаны, абаронца (калі ёсьць) і сьведка падчас допыту.

11. Прысяга прыносіцца па запыце Трыбунала.

12. У пачатку справы, Прэзыдэнт чытае кожны эпізод абвінавачанаму і пытае яго, ці прызнае ён сябе вінаватым.

13. Выкліканыя сьведкі падвяргаюцца крыжаванаму допыту спачатку бокам абвінавачаньня і затым Абаронцам, або абвінавачаным, калі ён сам праводзіць уласную абарону. Сьведкі могуць быць дапытаныя любым чальцом Трыбунала. Кожны бок можа патрабаваць паўторна выклікаць сьведку, які ўжо сьведчыў, пры гэтым патрэбны папярэдні дазвол Трыбунала. Трыбунал можа паўторна выклікаць любога сьведку. Сьведкі ня могуць пакідаць Трыбунал без дазволу

Трыбунала.

14. Трыбунал можа ў любы час, калі пажадае, правесьці закрытае паседжаньне, каб вырашыць узьніклыя пытаньні, кшталту дапушчальнасьці сьведчаньня.

15. Калі ўсе сьведкі выступілі, Абаронца падвядзіць вынікі і робіць заключны прамову да Трыбунала. Гэта адбываецца пасьля падвядзеньня вынікаў і заключнай прамовы Абвінавачаньня. Трыбунал затым пачынае закрытае паседжаньне, каб вынесьці вэрдыкт і прысуд.

16. У выпадках парушэньня любых Агульнавайсковых Распараджэньняў, Трыбунал ня мае права накласьці меншае пакараньне, чым прызначана ў такім Распараджэньні.

17. Вэрдыкт і прысуд Трыбунала павінен быць зафіксаваны ў пісьмовай форме і падпісаны трыма чальцамі Трыбунала. Усё гэта, разам са зьместам справы, павінна быць перададзена Прэзыдэнтам Кіраўніку Трыбунала. Прысуд падлягае ратыфікацыі Кіраўніком Трыбунала. Нататка: У выпадку сьмяротнай кары, прапанова павінна быць ратыфікаваная Ваенным Канвэнтам (Army Convention – AC).

18. Абвінавачаны можа абскардзіць вэрдыкт або прысуд, або адразу абодва рашэньні перад Генэрал-Ад'ютантам, які павінен прадставіць скаргу Кампэтэнтнай Уладзе. Скарга накіроўваецца абвінавачаным цераз яго каманднага афіцэра, які мусіць перадаць яе Генэрал-Ад'ютанту разам з падпісанай копіяй вэрдыкту, прысуду і зьместам справы. Кампэтэнтная Ўлада можа прызначыць новае паседжаньне або зьменшыць пакараньне, аднак ня можа павялічыць пакараньне, накладзенае Трыбуналам.

*Арыгінал Зялёнай кнігі:*
*http://uk.geocities.com/oglaigh_na_heireann32/THE_GREEN_BOOK.html*

